УДК 373.3.016:811.161.3

# РАЗВІЦЦЕ АРФАГРАФІЧНАГА НАВЫКУ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ З ВЫКАРЫСТАННЕМ ІНТЭРАКТЫЎНЫХ ПРАКТЫКАВАННЯЎ

***Э. У. Бякешка*** (МДУ імя А.А. Куляшова)
Навук. кір. ***Д.А. Доўгаль,***
ст. выкладчык

У сучаснай пачатковай адукацыі важным аспектам з’яўляецца развіцце арфаграфічнага навыку вучняў, што неабходна для авалодання пісьмовым маўленнем і далейшага паспяховага навучання. Арфаграфічны навык уключае веды і ўменні, неабходныя для правільнага напісання слоў; яго фарміраванне адбываецца ў некалькі этапаў: знаемства з арфаграмай, разуменне яе сутнасці, запамінанне спосабаў дзеяння, практычнае прымяненне і аўтаматызацыя [1, с. 17].

Адным з ключавых відаў інтэрактыўных метадаў навучання, які прадугледжвае актыўнае ўзаемадзеянне навучэнцаў адзін з адным, з настаўнікам і з навучальным матэрыялам, з’яўляюцца інтэрактыўныя практыкаванні, якія ўяўляюць сабой заданні, што выконваюцца навучэнцам у рэжыме анлайн. У залежнасці ад тыпу абранага практыкавання дадзены від заданняў можа выступаць сродкам практычнай падрыхтоўкі вучня [2, с. 1]. Інтэрактыўныя практыкаванні, створаныя з дапамогай розных анлайн-сэрвісаў, могуць істотна ўзбагаціць урок, калі педагог здолее пісьменна ўбудаваць практыкаванні ў структуру класічных заняткаў. Іх ужыванне асабліва дарэчы на такіх этапах, як актуалізацыя ведаў, вывучэнне новага матэрыялу, замацаванне і практычная дзейнасць, рэфлексія і падвядзенне вынікаў, дамашняе заданне.

Такім чынам, эфектыўнае авалоданне арфаграфіяй патрабуе не толькі засваення правіл, але і іх аўтаматызацыі праз розныя этапы навучання. Інтэрактыўныя практыкаванні, заснаваныя на выкарыстанні лічбавых тэхналогій і актыўным узаемадзеянні, значна павышаюць матывацыю вучняў і эфектыўна дапамагаюць у фарміраванні арфаграфічнага навыку.

**Літаратура**

1. **Антановіч, Н. М.** Навучанне арфаграфіі ў пачатковых класах : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Н.М.Антановіч. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2015. – 206 с.

2. **Богданова, Е. П.** Разработка интерактивных упражнений [Электронный ресурс] / Е.П.Богданова. – Режим доступа: – https://cdo.krasgmu.ru/uploads/ Разработка интерактивных упражнений.pdf. – Дата доступа: 14.01.2025.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова